# [14 кастрычніка - Дзень маці.](https://mpt.gov.by/news/13-10-2016-1221)

Дзень 14 кастрычніка трывала ўвайшоў у гісторыю Беларусі як свята ўшанавання жанчын-маці. У гэтым годзе Дзень маці адзначаецца 20-гадовым юбілеем і з 10 па 16 кастрычніка ў рэспубліцы праходзіць Тыдзень маці.

Міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей Папкоў накіраваў віншавальную тэлеграму жанчынам-маці з цудоўным святам - Днём маці!
"Гэта свята не проста даніна беражлівага і паважлівага стаўлення да жанчыны-маці, але і прызнанне вашай вялізнай ролі ў жыцці грамадства. Самае выдатнае на зямлі слова - мама. Гэта першае слова, якое прамаўляе чалавек, і гучыць яно на ўсіх мовах аднолькава пяшчотна. менавіта маці мы абавязаны жыццём, сямейнай утульнасцю, усім лепшым, што ў нас ёсць ", - гаворыцца ў тэлеграме.

Кіраўнік ведамства пажадаў усім маці моцнага здароўя, мацярынскага шчасця, удзячных дзяцей і радасці ад кожнага пражытага дня, міру і дабрабыту.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/13-10-2016-1221*